ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА *ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.*

ПАГОНЯ

№ 17 (116) *5 – 11 траўня 1995 г.* *Кошт 300 рублёў*

ВІНШУЕМ СА СЬВЯТАМ ПЕРАМОГІ !

КДБ І МУС ШУКАЮЦЬ «БЕЛАРУСКУЮ ВЫЗВАЛЕНЧУЮ АРМІЮ»

На адрас дырэктара Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А.Суворава прыйшоў ліст ультыматыўнага зьместу. Яго складальнікі - сябры невядомай дагэтуль "Беларускай вызваленчай арміі".

У лісьце згадваецца: "Мы патрабуем тэрмінова правесьці рэарганізацыю музея імя А.Суворава ў звычайны беларускі краязнаўчы музей. Дэмантаваць, але не зьнішчаць бюсты і помнікі Сувораву. Перайменаваць вуліцу і парк, якія носяць імя расейскага заваёўніка. У адваротным выпадку арганізацыя "Беларускай вызваленчай арміі". будзе вымушана прымяніць акцыю тэрору, чаго яна сама не жадае. Мы хочам захаваць помнікі і бюсты Суворава, а таксама экспазіцыю музея як рэчавы доказ расейскай акупацыі".

У лісьце згадана, што Беларускі Народны Фронт і Беларускае згуртаваньне вайскоўцаў да гэтага ліста адносін ня маюць.

КДБ і МУС распачалі пошук асоб, склаўшых гэты ліст.

ШТАТ ПАШЫРАЕЦЦА

Берасьцейскія ўладныя маюць жаданьне аблегчыць цяжкасьці грамадзян, якія хочуць атрымаць шматразовую візу ў замежным пашпарце. Згодна рашэньню гарвыканкаму, з першага траўня ў штат пашпартна-візавай службы ўведзены тры новыя пасады вольнанаёмных супрацоўнікаў.

Утрыманьне дадатковых рабочых месц па самых сьціплых падліках абыдзецца гарадзкому бюджэту ў 45 мільёнаў рублёў.

СІМ

ДА МЕСЦА ВЕЧНАГА СПАЧЫНКУ

30-га красавіка на вайсковых могілках Горадні адбылося перазахаваньне загінуўшых падчас першых дзён Вялікай айчыннай вайны жаўнераў.

Г.А.

Фатаграфаваў: У.УЛАДАСЕВІЧ.





ЧЫТАЙЦЕ І ВЫПІСВАЙЦЕ "ПАГОНЮ"

- газэту, якая паведамляе пра тое, што больш нідзе ня будзе надрукавана.

Акрамя таго, кошт падпіскі на квартал на
- "Народную газету" складае - 39 тысяч рублёў;
- "Гродзенскую праўду" - 24 тысячы рублёў;

а на "ПАГОНЮ" толькі 9 тысяч рублёў.

Зрабіце свой выбар самі !

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Беларусі
"Белсаюздрук"

АБАНЭМЭНТ на газэту 63124

"ПАГОНЯ"	Колькасьць камплектаў	1

на 1995 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	X	X	X	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газэту 63124

ПВ | Месца | літар

"ПАГОНЯ"

Кошт	падпіскі	9000 руб.	Колькасьць камплектаў	1
	пера-адрасоўкі	руб.		

на 1995 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	X	X	X	10	11	12

Куды ________ (паштовы індэкс) ________ (адрас)

Каму ________ (прозьвішча, ініцыялы)

ЮРЫСТЫ САБРАЛІСЯ Ў ГОРАДНІ

У Гарадзенскім дзяржаўным універсітэце прайшла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і рэфармаваньне прававой сістэмы".

Канферэнцыю арганізавалі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Гарадзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы, кафедра тэорыі і гісторыі дзяржаўнага права, Беларускі рэспубліканскі фонд падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Льва Сапегі.

У працы канферэнцыі ўзялі ўдзел навукоўцы, юрысты з Менску, Горадні і іншых гарадоў Беларусі. Завяршылася канферэнцыя працай дэлегацый у секцыях.

ГАБРЭІ ЗЬБЯРУЦЦА Ў ЖАЛУДКУ

Дзень юбілею Перамогі гарадзенскія габрэі мяркуюць адзначыць у мястэчку Жалудок. Менавіта ў гэты дзень, дзевятага траўня 1942 года сьпецпадразьдзяленьне войск СС расстраляла тут больш за дзьве тысячы габрэяў.

Плануецца, што на ўшанаваньне памяці загінуўшых прыедуць габрэі з Летувы, Расеі, Узбекістану, Польшчы.

Г.Ю.

НАСТАЎНІКАМ НЕ ЗАПЛАЦІЛІ І ЯНЫ ЗАБАСТАВАЛІ

26 красавіка калектыў настаўнікаў Воранаўскай сярэдняй школы аб'явіў забастоўку. Прычына правядзеньня забастоўкі самая звычайная: настаўнікам своечасова ня выплацілі заробак.

АДМЯЖОЎВАЕМСЯ

З першага траўня Ашмянскі раён стаў памежнай зонай.

У сувязі з гэтым трапіць туды зможа той, у каго ў памежнай зоне жывуць сваякі. Білеты на пездку ў Ашмяны можна будзе набыць толькі пры наяўнасьці даведкі, якую жадаючаму змогуць выдаць мясцовыя ўладныя.

СКРАДЗЕНЫ КУЛЯМЁТ ШУКАЮЦЬ ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Некалькі дзён таму, у вучэбным мотастралковым палку, што дыслакуецца ў Барысаве, выяўлены недахоп трох буйнакаліберных кулямётаў. Папярэднім расьследаваньнем выяўлена, што кулямёты скрадзены яшчэ ў 1991 годзе падчас адпраўкі бронетэхнікі на рамонт. Стала вядома, што да крадзяжу мае дачыненьне група вайскоўцаў, адказных за рамонт зброі. Менавіта рамонтнікі па падробленых дакумантах чатыры гады хавалі факт крадзяжу. Чыстасардэчнае прызначэньне аднаго з падазроных каманьдзіру палка дазволіла знайсьці адзін з кулямётаў.

ГАСПАДАР НЕ АДГУКНЕЦЦА

Днямі ў сталічным мікрараёне Шабаны і ў горадзе Койданава (Дзяржынск) супрацоўнікі праваахоўчых органаў выявілі 10 фургонаў каньяку і гарэлкі. Моцныя напоі захоўваліся на складах будаўнічай арганізацыі. Па зьвестках міліцыянтаў, вадкі тавар належыць аднаму гаспадару. Сьледчыя лічаць, што ён, гаспадар, наўрад ці знойдзецца, паколькі яму пагражае выплата вялізарнай сумы акцызнага падатку.

СІМ



ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

«СЯБРЫ АПАЗІЦЫІ МОГУЦЬ ГАНАРЫЦЦА СВАЁЙ ДЗЕЙНАСЬЦЮ»

Мікола Маркевіч - чалавек, імя якога добра ведаюць у Горадні. Працаваў у газетах "Высота", "Гродненская правда", "Народная газета". Цяпер рэдагуе незалежную газету "Пагоня", якую фактычна сам і стварыў.

Акрамя таго, актыўны дзеяч Беларускага Народнага Фронту. Дэпутат Вярхоўнага Савета. Зноў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета 1323 жыхарамі мікрараёну Прынёманскі і Соймам Народнага Фронту.

- Спадар Мікола, не пасьпеў скончыцца тэрмін Вашай папярэдняй дэпутацкай кадэнцыі, а Ваша імя зноў у сьпісах для галасаваньня. Мабыць, праўду кажуць, што дэпутацкае крэсла не самае жорсткае?

- Гэта для каго як. Для тых, у каго была задача, вобразна кажучы, "мякка" сядзець, добра пад'есьці і г.д., - мабыць яно так і было. Для мяне ж, як для сябра Апазіцыі Беларускага Народнага Фронту, усе 5 гадоў дэпутацтва былі гадамі жорсткіх выпрабаваньняў і цяжкай працы. У адрозьненьне ад камуністычнага "балота", якое складала 92 дэпутаты складу былога Вярхоўнага Савета, сябры Апазіцыі могуць ганарыцца сваёй дзейнасьцю ў вышэйшым заканадаўчым органе краіны. Нашая праца была вызначальнай у стварэньні Дэкларацыі аб суверэнітэце, Канстытуцыі рэспублікі, цэлага шэрагу заканадаўчых актаў, якія стварылі нарматыўную базу маладой незалежнай дзяржавы. Дзякуючы нашым намаганьням, у свой час Вярхоўны Савет адклікаў нашых хлопцаў з так званых "гарачых кропак" Савецкай імперыі, быў абвешчаны прынцып нейтралітэту, які ня даў магчымасьці пасылаць цяпер беларускіх салдатаў у Таджыкістан, Чачню...

У той жа час, 118 законапраэктаў, распрацаваных Апазіцыяй, былі адхіленыя ад разгляду гэтым Вярхоўным Саветам. Не таму, што былі дрэннымі, а таму, што былі законапраэктамі менавіта Апазіцыі. Успомніце, колькі бруду і хлусьні кебічаўскія, а потым лукашэнкаўскія, сродкі масавай інфармацыі выліліна Апазіцыю, на Фронт, на кожнага з нас асабіста. Дзейнасьць кожнага з нас разглядалася амаль што з дапамогай мікраскопа, толькі праз чорныя акуляры...

- Шырока вядома, што і Ваша імя гучала пры гэтым...

- Так. І шырока вядома, і шырока гучала. А вось пра вынік - маўчок. І ёсьць пра што маўчаць. У выніку больш чым 20 праверак гаспадарчай дзейнасьці грамадзянскай дабрачыннай арганізацыі - культурна-асьветніцкага фонду "Бацькаўшчына", які зьяўляецца заснавальнікам газеты "Пагоня", - Генеральная пракуратура Рэспублікі прыйшла да высновы, што ў дзеяньнях Міколы Маркевіча няма ні "складу злачынства", ні "падзеі злачынства". Незаконна забраныя штрафы фонду былі вернутыя, праўда, без уліку інфляцыі... Маўчаць і пра тое, што Маркевіч не змаглі спакусіць высокай пасадай, ні пяціпакаёвай кватэрай у Менску. Маўчаць пра тое, што ў Маркевіча няма ні шыкоўных катэджаў, ні іншамарак, ні рахункаў у замежных банках. Маўчаць пра тое, што Маркевіч і Апазіцыя не галасавалі за дэпутацкія прывілеі. Ім няма што гаварыць. Я і мае сябры папросту выпадаем з іхняй логікі, згодна якой "каб жыць у радасьці і шчасьці, дык трэба красьці, красьці, красьці".

- Вы былі ўдзельнікам знакамітай галадоўкі дэпутатаў Апазіцыі, якую гвалтоўна разагналі ўзброеныя салдаты з атрадаў сьпецпрызначэньня ўнутраных войскаў. Шмат каму незразумелы і дагэтуль сэнс гэтай акцыі. Многія і зараз ня ведаюць, што адбылося?

- Прадажныя журналісты і іх злачынныя кіраўнікі зрабілі ўсё магчымае, каб прадставіць гэтую падзею, як нязгоду дэпутатаў Апазіцыі "посоветоваться с народом", маючы на ўвазе, што повадам для галадоўкі стала іншая нязгода з сілком навязанным мінскім рэферэндумам па сымболіцы, мове, інтэграцыяй з Расеяй і праву Лукашэнкі распускаць Вярхоўны Савет. Але ж гэта была апошняя кропля ў тым ланцугу ўседазволу і беззаконьня, якія зараз пануюць на Беларусі. Мы вычарпалі усе магчымыя сродкі пратэсту супраць лукашэнкаўскага "беспредела", які замест таго, каб выконваць свае перадвыбарчыя абяцаньні, заняўся гандлем Беларусі. Гэтай галадоўкай мы хацелі прыцягнуць увагу людзей да таго, што аб'екты, якія па значнасьці набліжаюцца, напрыклад, да байканура, здаюцца ў бясплатную арэнду расейскай ваеншчыне, што расейскія мафіёзі па-ранейшаму бясплатна качаюць па нашым нафта- і газаправодзе энерганосьбіты, што карупцыянеры, якія кіравалі пры Кебічы, ня толькі дагэтуль не пакараныя, але наватперасялі ў больш утульныя крэслы...

Вынік жа гэтай акцыі вядомы. Нас жорстка зьбілі і гвалтоўна выкінулі з Авальнай залы, і гэта сьвядомы крок палітыкі Лукашэнкі, які асабіста кіраваў гэтымі бандытамі. Ён усьведамляе, што няўмольна надыходзіць час расплаты за перадвыбарчую хлусьню, за здрадніцкую палітыку ў адносінах да сваёй Бацькаўшчыны і свайго народу, за поўны правал у сацыяльнай і эканамічнай палітыцы. І ён робіць усё магчымае, каб застрашыць людзей, давесьці іх да такога стану, пры якім, як сказаў Янка Купала, "і крыкнуць ня можаш "ратуйце", і мусіш ты "дзякуй" крычаць".

На нашых вачах адбыўся дзяржаўны пераварот. Уся ўлада сканцэнтравана ў руках непрадказальнага, недасьведчанага, варожага да беларушчыны чалавека. Усе: суды, пракуратура, войска, міліцыя, "вертыкаль", друк... Гэта - дыктатура камуна-фашысцкага кшталту.


- Дэпутат Маркевіч вядомы таксама і сваімі выступамі ў Вярхоўным Савеце ў абарону польскіх школ. Трошкі дзіўная сітуацыя: у зале сядзяць каля 40 дэпутатаў-палякаў, а польскую школу абараняе беларус.

- Нармальны чалавек, патрыёт сваёй Бацькаўшчыны, той, хто жадае дабра сваёй Радзіме, ня будзе моўчкі сядзець ні тады, калі гвалтуюць яго родную маці-мову на Рэферэндумах, ні тады, калі штосьці дрэннае робяць у адносінах да суседа. Беларусы і палякі, якія жывуць тут на гарадзеншчыне, гэта тыя самыя суседзі, браты. Мы - тутэйшыя. Мы жывем у адной дзяржаве, у адным доме. І ня будзе ў доме шчасьця, калі будзе пакрыўджаны хаця б адзін чалавек, які жыве ў гэтым доме. Размова ідзе ня толькі пра палякаў, але і пра рускіх, татараў, габрэяў.

І тут мы зноў вяртаемся да пытаньня пра пануючае сёньня беззаконьне. Справа польскіх школ - гэта ня толькі справа маралі нашчадкаў імперскіх чыноўнікаў, якія па ранейшаму хочуць выхоўваць з нашых дзетак янычараў - "савецкі народ", людзей, пазбаўленых сваіх каранёў. Справа ў тым, што парушаецца Канстытуцыя, законы аб мовах, аб адукацыі, аб нацыянальных прыналежнасьцях. Парушаецца законнае права людзей, якія, па-сутнасьці, ёсьць гаспадарамі гэтай зямлі.

- Адвечнае пытаньне: што рабіць людзям у гэтай сітуацыі?

- Быць людзьмі. Выконваць біблейскія запаведзі. Не выконваць злачынных загадаў злачынных начальнікаў. Не абіраць злачынцаў начальнікамі...



ПРАЦЯГВАЮЦЬ ЛІЧЫЦЬ «ВОРАГАМІ НАРОДУ»?

АДКРЫТЫ ЛІСТ ПРЭЗІДЭНТУ РЭСПУБЛІКІ А.Р.ЛУКАШЭНКУ

Шаноўны Аляксандр Рыгоравіч!

Азнаёміўшыся з выкладзенай у газетах Пастановай Кабінета Міністраў аб матэрыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян у сувязі са сьвяткаваньнем 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, мы не знайшлі адной катэгорыі грамадзян, з якой цяпер мала засталося жывых, але якая была шматлікай у гады вайны і сваёй працай унесла істотны ўклад у дасягненьне Перамогі.

Мы маем на ўвазе перш за ўсё былых вязьняў сталінскага ГУЛАГа, якія ў нечалавечых умовах, у голадзе і холадзе пры 12-гадзінным працоўным дні, без усялякіх выхадных здабывалі золата на Калыме, валілі лесанарыхтоўкі ў Сібірскай тайзе, будавалі чыгуначныя дарогі, здабывалі вугаль і руду ў шахтах без усялякай тэхнікі бясьпекі. Мы маем на ўвазе таксама ссыльных і адміністратыўна высланых за межы Беларусі так званых сьпецпасяленцаў, адарваных ад родных месцаў, пазбаўленых маёмасьці, якія былі мабілізаваны на працоўны фронт і цяжкай працай дапамагалі атрымаць Перамогу. Гэтыя людзі, нашы грамадзяне, былі ў той час рэпрэсаваны па палітычных матывах, а потым рэабілітаваны (у кожнага ёсьць адпаведны дакумант), але, відавочна, рэабілітаваны не да канца, хаця ў дакумантах напісана "поўнасьцю".

Інакш, чым можна растлумачыць тое, што ўрад не ўключыў іх у пералік катэгорый грамадзян, якім аказваецца матэрыяльная падтрымка з нагоды юбілею Перамогі? Папросту забыліся? Ці сьвядома імкнуцца аддаць забыцьцю гэтую змрочную старонку айчыннай гісторыі? Ці спадзяваліся, што нікога з вязьняў ваенных гадоў ужо не засталося ў жывых? А можа быць, у глыбіні душы, працягваюць іх лічыць "ворагамі народу"?

У надзеі на тлумачэньне Вашай пазіцыі і тлумачэньня дапушчанай урадам несправядлівасьці па даручэньню савета Гарадзенскага абласнога таварыства ахвяр палітычных рэпрэсій

Павел ЖУК,
старшыня таварыства,
сябра праўленьня Беларускай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій,
Андрэй ФІРСАЎ,
адказны сакратар таварыства.

РАДА ЭЎРОПЫ ЧАКАЕ БЕЛАРУСЬ

26-30 красавіка ў Менску адбыўся афіцыйны візіт дэлегацыі Рады Эўропы на чале з Прэзідэнтам Палаты мясцовага самакіраваньня, Кангрэсу мясцовых і рэгіянальных Улад Саветаў Эўропы Ёзэфам Гофманам.

Мэтай візіту стала распрацоўка сьпецыяльнай праграмы LODE (Лакальная Дэмакратыя), якая прадугледжвае супрацоўніцтва паміж урадавымі і няўрадавымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь і структурамі Рады Эўропы.

Праграму візіту распрацавала Беларуская філія дэмакратычных рэформ імя Л.Сапегі сумесна з Міністэрствам замежных спраў Беларусі.

Падчас візіту Ёзэфа Гофмана адбыліся афіцыйныя сустрэчы з намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта М.Сазонавым, старшынёй Мінгарвыканкама Ул.Ярмошыным, намесьнікам старшыні Мінгарсавету А.Гурыновічам, членамі пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савету па эканамічнай рэформе.

На думку старшыні Беларускай філіі фонду імя Л.Сапегі Георга Куневіча, прадстаўнікі дзяржструктур Беларусі не зусім правільна, а часам і супярэчліва трактуюць палажэньні Эўра-Хартыі мясцовага самакіраваньня. Гаворка ідзе, з аднаго боку, аб выканаўчых органах прадстаўнікоў улады ў "муніцыпалітэтах", а з другога боку, аб выканаўчых органах адміністрацыйных дзяржаўных структур кіраваньня.

Спадар Ёзэф Гофман і яго намесьнік Густаў Мюрдрых цікавіліся, ці імкнецца Рэспубліка Беларусь да Рады Эўропы. Выказвалі пажаданьні, што палата самакіраваньня будзе задаволена бачыць там і прадстаўнікоў Беларусі.

Госьці са Страсбурга цікавіліся і ходам перадвыбарчай кампаніі ў Вярхоўны Савет і Мясцовыя Саветы.

Т.М.

КАСЕТЫ, НА ЯКІЯ ЗАПІСВАЛАСЯ ЗЬБІЦЬЦЁ ДЭПУТАТАЎ, ВЯРНУЛІ СЬЦЁРТЫМІ

Паведамленьні беларускіх сродкаў масавай інфармацыі аб тым, што плёнкі з запісам інцыдэнта, адбыўшагася ў ноч з 11 на 12 красавіка ў Авальнай зале Дома ўраду, перададзеныя ў пракуратуру, не адпавядаюць рэчаіснасьці. Як паведаміў карэспандэнту старэйшы сьледчы па асоба важных справах рэспубліканскай Пракуратуры Язэп Бролішс, ніякіх касет з запісам гэтых падзей у сьледзтва няма. Больш таго, па словах Я.Бролішса, людзі, якія здымалі той інцыдэнт, у сваіх паказаньнях паведамілі, што ім вярнулі касеты са сьцёртым запісам. Аднак старшыня Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Рыгор Кісель заяўляў, што гэты відэазапіс перапісваецца на касеты для трансьляцыі па тэлебачаньню. 20 красавіка Язэп Бролішс афіцыйна папрасіў Кіселя хоць паказаць відэаматэрыялы сьледзтву, аднак старшыня НТРК дагэтуль захоўвае маўчаньне.

Па словах Бролішса, сьледзтву аказваецца актыўнае супрацьдзеяньне. У прыватнасьці, сьпецназаўцы, якія зьдзейснілі аперацыю па выдварэньню дэпутатаў з Авальнай залы, не зьяўляюцца ў пракуратуру для дачы паказаньняў, матывуючы свой адказ тым, што для гэтага неабходна распараджэньне кіраўніцтва.

СІМ

«САБОРАЎЦЫ» АБЯЦАЮЦЬ НЕПАСЛУХМЯНЫХ БІЦЬ ПАЛКАЙ

СС "Белая Русь" па ўсіх выбарчых акругах Полаччыны выставіць сваіх кандыдатаў у дэпутаты. Мясцовых людзей "сабораўцы" не знайшлі. Таму ў Полацк і Наваполацк панаехала "варагаў" з Віцебску і Менску. У тым ліку сам старшыня Славянскага Сабору М.Сяргееў. Гэтыя "місіянеры" пачалі ўвішна выхоўваць тутэйшых уплывовых людзей - рэдактараў газет, кіраўнікоў прадпрыемстваў і прыватных фірмаў, дырэктараў друкарняў.

Рэдактарка наваполацкага расейскамоўнага "Хіміка" Ігнаценкава адмовілася падтрымліваць "сабораўцаў" і назвала іх галоўным дэстабілізуючым фактарам у рэспубліцы. На патрабаньне надрукаваць іх праграмы ў беларускамоўным "Полацкім весьніку" па-расейску, рэдактар Кавалеўскі зазначыў, што нават у часы нямецкай акупацыі газета выходзіла па-беларуску.

Але найбольш скандальная размова адбылася з дырэктаркай Наваполацкай друкарні Белавус. Гэтая жанчына таксама выказала сваё адмоўнае стаўленьне да СС "Белая Русь". На пытаньне, чаму ж тады яна кепска валодае роднай мовай, дырэктарка адказала, маўляў, спадзяецца, што матчыну мову добра будуць ведаць яе ўнукі. Гэтыя словы ўвялі "сабораўцаў" у шал. Яны ляманталі, што ўнукі дырэктаркі будуць замінаць іхнім унукам размаўляць па-расейску і што такіх беларусаў, якія размаўляюць па-расейску, але падтрымліваюць беларускую мову, трэба біць палкамі.

Алесь КОЗІК.

"ПАРУШЭНЬНЕ ЗАКОНА ПАВІННА ХВАЛЯВАЦЬ УСІХ". ТАК, ПРЫНАМСІ, ЛІЧЫЦЬ ЯГОР ГАЙДАР

У Менск па запрашэньню Аб'яднанай дэмакратычнай партыі (АДПБ) прыбыў лідэр партыі "Выбар Расеі" Ягор Гайдар.

Спадар Гайдар узяў удзел у сімпозіуме "Эканоміка пераходнага перыяду. Вопыт і перспэктывы", дзе выступіў з дакладам аб эканамічным перабудаваньні ў Расеі. Адказваючы на пытаньні журналістаў аб будучых беларуска-расейскіх зносінах, спадар Гайдар заявіў: "Эканамічная інтэграцыя Расеі і Беларусі магчыма толькі на ўзаемавыгаднай аснове. У Расеі няма дыскусій у неабходнасьці эканамічнай інтэграцыі нашых краін. Але гэты працэс магчымы толькі пры выпрацоўцы агульных механізмаў рэгуляваньня рынкаў Беларусі і Расеі". У той жа час Ягор Гайдар лічыць, што рэформы павінна праводзіць сама Беларусь, не чакаючы дапамогі з боку. Пры гэтым, экс-прэм'ер расейскага ўраду параіў Беларусі больш выкарыстоўваць вопыт рэфармаваньня эканомікі краін Прыбалтыкі і Польшчы. Каментуючы зьбіваньне беларускіх дэпутатаў у парламанце, спадар Гайдар сказаў, што гэта не зьяўляецца справай толькі Беларусі, таксама, як і Чачня не зьяўляецца ўнутранай справай Расеі. "Парушэньне закона павінна хваляваць усіх", - зазначыў Ягор Гайдар.

СІМ

ВЯЛІКАРОСАМ - ЖЫЦЬ, БЕЛАРУСАЎ І ЛЯХАЎ - НА ШЫБЕНІЦУ

Трынаццаць сівых бабулек і дзядулек сабраліся першага траўня ў Горадні на пляцы імя праваднікоў пралетарыяту, каб ушанаваць міжнародны дзень працоўных. Збоку, гэтыя старыя нагадвалі дзяцей, якія хочуць пагуляць, але ня ведаюць, як наладзіць гульні. Адным словам, ні маёўкі, ні мітынгу не атрымалася. Рэдкія прахожыя, пасьмейваючыся, міналі крыклівых старых, што даходзілі да істэрыкі ў спрэчках паміж сабой. Асабліва завіхаўся адзін сівагаловы ветэран, які крычаў: "Палякаў і беларусаў трэба вешаць, страляць!" Адзіная нацыя, што можа жыць тут - гэта вялікі рускі народ". На гэтых агрэсіўных выкрыках-выбарках першатравеньская акцыя ветэранаў-камуністаў Горадні ў знак салідарнасьці ўсіх працоўных і скончылася.

Г.ДАМІНІКАНСКІ.

ГРАМАДЗТВА

ПАКЛАДЗЕШСЯ СПАЦЬ ГАСПАДАРОМ, НАЗАЎТРА - ПРАЧНЕШСЯ БЯЗДОМНЫМ

Аляксандр Анатольевіч Латышаў. Нарадзіўся ў 1958 годзе ў Горадні. Пасьля службы ў войску паехаў у Маскву. Пяць год таму, зарэгістраваў разам з сябрамі ў Маскве гандлёва-вытворчае таварыства імя А.І.Палкіна. Частыя раз'езды, тэрміновыя справы не пакінулі па-за ўвагай спадара Аляксандра родную Бацькаўшчыну. Нядаўна, на Вялікдзень, Аляксандр Анатольевіч наведаў Горадню. Падчас яго нядоўгага побыту у роднай хаце і адбылася наша гутарка.

- Апошнія гады ты жывеш у Маскве, шмат часу працуеш у краінах Прыбалтыкі. Ці можаш параўнаць тое, што адбываецца там у іх, з пераменамі на Беларусі?

- Вельмі хацелася б паставіць родную Беларусь ва ўсіх адносінах у адзін шэраг з Эстоніяй, Латвіяй, Летувой. Але, як нельга павярнуць рэкі, так нельга і раўняць становішча Беларусі з вышэйзгаданымі дзяржавамі. Гэта тычыцца ня толькі эканамічных, культурных, палітычных пераўтварэньняў, у вялікай ступені гэта стасуецца з духам грамадзян гэтых краін. Яны ўзялі за ўзор вопыт эўрапейскіх краін і імкнуцца гэты вопыт выкарыстаць дзеля ўласных інтарэсаў. На жаль, такога імкненьня выкарыстаць гэтае ж тут, на Беларусі, у сваіх землякоў я не заўважыў. Наадварот, стварылася такое ўражаньне, што ў тутэйшых людзей няма вялікай ахвоты станавіцца гаспадарамі на сваёй зямлі. Ня ведаю, адкуль такая абыякавасьць, бо ў Маскве я сустракаў мноства сваіх былых суайчыньнікаў, якія вельмі ўдала вядуць свой бізнэс ў Расеі. Што перашкаджае беларусам быць актыўнымі на Бацькаўшчыне - ня ведаю. Хацелася б верыць, што аморфнасьць у беларусаў не ад лянопы, а ад нейкіх іншых, незалежачых ад іх прычын. Відаць, звонку гэтага адразу не заўважыш. Патрэбен час, каб ва ўсім разабрацца. Сёе-тое я ўжо прыкмеціў, прааналізаваў.

- Можа падзелішся тым, што ты заўважыў тут?

- Галоўная недарэчнасьць - у вас няма лідэра. Я маю на ўвазе першых асоб дзяржавы. Няма каму ўзяць на сябе ўвесь цяжар адказнасьці за новае дзяржаўнае будаваньне, за новы дзяржаўны лад. Народ нагадвае гульца, якога ўцягнулі ў гульню, ня вартую яго. Наўзамен сапраўдных рэформ - нейкія сумніцельныя гонкі ў выкрываньні карупцыянераў, мафіозі. Гэта ня справа, а сьмех.

- Саша, нагадаю табе, што ў Беларусі ёсьць сіла, якая здольна зьдзейсьніць рэформы. Гэта - Беларускі Народны Фронт. Тваё меркаваньні пра гэта?

- Ведаю пра Беларускі Народны Фронт шмат. Бацькі мне пісалі, што на прэзідэнцкіх выбарах кандыдат ад БНФ З.С.Пазьняк меў на Гарадзеншчыне значны посьпех. Але нельга разьлічваць на адзін рэгіён, як на гарант посьпеху. Неабходна, каб ідэі Фронту паўсюдна былі папулярнымі. Беларускі Народны Фронт меў час, каб давесьці да народа свае мэты. Калі народ імі ня стаў, як кажуць, трызьніць, то нешта ня так тлумачылася, ці ня так рабілася. Хутка ў вас выбары. Калі на іх БНФ атрымае большасьць, то за лёс Беларусі ня трэба будзе турбавацца. Калі ж пераможуць тыя сілы, што прагнуць рэферэндуму, - Беларусі, як суверэннай дзяржаве, на шмат разьлічваць ня прыдзецца. Можа стацца так, што сёньня пакладзешся спаць гаспадаром, назаўтра можаш прачнуцца бяздомным. І гэта ня проста словы. Безкантрольная прыватызацыя фірмамі, сумеснымі прадпрыемствамі, акцыянернымі таварыствамі дзяржуласнасьці ў Расеі паказала, што народ, пра які, нібыта, усе дбаюць і які ўсе абараняюць, заўжды застаецца падманутым.

Гутарыў Г.АСТРОЎСКІ.

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ТАРЫФАЎ ЗА ЖЫЛЬЛЁВА-КАМУНАЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ МЫ АДЧУЕМ З ПАЧАТКУ НОВАГА АЦЯПЛЯЛЬНАГА СЕЗОНА

Аналізуючы выказваньне прэзідэнта Беларусі аб тым, што ён не дазволіць падвысіць тарыфы аплаты за жыльлёва-камунальныя паслугі, міністр жыльлёва-камунальнай гаспадаркі рэспублікі Барыс Батура заявіў, што гэта прывядзе да паралiча ўсяго жыльлёва-камунальнага комплексу Беларусі. Па словах міністра, сродкі, прадугледжаныя ў бюджэце дзяржавы на жыльлёва-камунальную гаспадарку на 1995 год, складаюць толькі адну трэць ад агульных патрэб галіны. "Аднак і гэтых сродкаў проста няма, фінансаваньне поўнасьцю перапынена", - адзначыў спадар Батура. Зараз міністр жыльлёва-камунальнай гаспадаркі накіраваў ва ўрад свае прапановы па павышэньню тарыфаў да 40% прыплаты насельніцтвам ўсіх затрат. Калі гэтыя прапановы будуць прыняты, лічыць міністр, то гэта створыць магчымасьць падрыхтавацца да ацяпляльнга сезону 1995-1996 г.г.

У той жа час спадар Батура выказаў заклапочанасьць невыкананьнем Кабінетам Міністраў Беларусі ўласных пастаноў. У прыватнасьці, практычна адсутнічае фінансаваньне пастановы Кабінета Міністраў N 505, прадугледжваючых устаноўку ў новых дамах лічыльнікаў цяпла, газу і вады.

P.S.: Калі інфармацыя была ўжо падрыхтавана да друку, стала вядома, што тарыфы за жыльлёва-камунальныя паслугі вырасьлі на астранамічную велічыню. Аднак, у поўнай ступені мы адчуем гэта на сабе ў першы ж месяц будучага ацяпляльнага сезону.

С.БАГДАНКЕВІЧ ЗАСТАЕЦЦА

Даючы тлумачэньні аб верагоднасьці сваёй адстаўкі, кіраўнік Нацбанка Беларусі Станіслаў Багданкевіч заявіў: "Пакуль ніякіх афіцыйных дакумантаў я ня бачыў. Мне будзе вельмі шкада, калі гэтая інфармацыя пацьвердзіцца, і я ня здолею працаваць на дабрабыт свайго народу". У той жа час спадар Багданкевіч лічыць, што магчымай прычынай адстаўкі стане разыходжаньне пазіцыі Нацбанка і Кабінета Міністраў па вялічыні стаўкі рэфінансаваньня. Станіслаў Багданкевіч паведаміў, што 21 красавіка павінна была адбыцца яго сустрэча з прэзідэнтам, але А.Лукашэнка на яе не зьявіўся. Старшыня Нацбанка мае цяжкасьці з каментарам верагоднасьці таго, што пасьля яго адстаўкі Нацбанк узначаліць Міхал Чыгір, а вызваліўшуюся пасаду прэм'ера зойме старшыня зьнешнеэканамічнага ведамства Беларусі Міхаіл Марыніч.

СІМ

ВЯЗЕНЬ НУМАР 20980

Міхаіл Міхайлавіч Карніла - вязень фашысцкіх канцлагераў. Усё сваё жыцьцё пражыў у г.Скідалі, працаваў рабочым, адукацыя - пяць класаў, удзельнічаў у нацыянальна-вызваленчым руху ў часы Польскай дзяржавы. Цяпер быломy вязьню 78 гадоў, ён інвалід другой групы. З ім гутарыць наш пазаштатны карэспандэнт.

- Міхаіл Міхайлавіч, ці радуе Вас сьвята Перамогі?

- Больш засмучае, чым радуе. Таму, што за 50 гадоў я ня змог дабіцца праўды. Калі прыйшлі Саветы, дык мяне ў 1940 годзе ўзялі ў Чырвоную Армію на тры месяцы, а пратрымалі 105 дзён. Тэрміноваму прызыву я не падлягаў, бо не падыходзіў па ўзросту. Другі раз узялі 17 траўня 1941 года на 45 дзён. Дзевяць дзён не хапіла, каб вярнуцца дамоў, пачалася вайна. У першыя хвіліны наш 284 стралковы полк прыняў бой. Два тыдні мы змагаліся ў атачэньні. У баі я быў цяжка кантужаны. Выратавала польская сям'я Казіміра Касьціка, што з вёскі Рафалаўка. Гэта ў 17 км ад Беластока. Гэтыя добрыя людзі прытулілі мяне, дапамаглі стаць на ногі. Затым палон, але ж пашанцавала выкруціцца з яго. Вярнуўся да сям'і, ды не надоўга. Арыштавалі па даносу солтыса і яго памочніка, маўляў, я быў удзельнікам вызваленчага руху. Смуткую, і ніколькі мяне ня радуе сьвята Перамогі, што я ў Айчыннай вайне - другасны чалавек. Хаця...

- А што, Вы ня ўдзельнік вайны?

- Так.

- Чаму ж?

- Ад нашга палка ў першыя дні баёў засталіся, як гавораць, рожкі ды ножкі, палявых дакумантаў не захавалася. А бюракраты з ваенкамата ня вераць. Давай паперку, толькі тады трымаеш статус "ветэрана". Абіваў парогі сотні разоў, а затым плюнуў. Цяпер з цяжкасьцю рухаюся, давялі да нервовага захворваньня, ад чаго атрымаў інсульт.

- А як жа апынуліся ў канцлагеры?

- Ну я ж кажу, што выдалі мясцовыя ўлады. А ў канцлагеры Штутгоф апынуўся 25 сакавіка 1943 года, як палітычны. Хаця ад палітыкі ўжо даўно адышоў. Са мной разам апынуліся і іншыя жыхары Скідаля: браты Мазалеўскія, І.Р.Дзелянкоўскі і людзі з навакольных вёсак. Жывымі засталіся толькі некалькі чалавек, астатнія загнуліся. Са Скідаля выжыў я адзін. Выжывалі людзі моцныя духам.

- А якія былі ўмовы ўтрыманьня?

- Жудасныя. Нас марылі голадам, зьдзекваліся. Працяглы час быў камендант-зьвер. Пастроеных на плацу вязьняў ён абыходзіў



старанна ўглядваючыся ў іх твары. Калі твар не падабаўся, загадваў вязьню выйсьці са строю і тут жа ўдарам рукі ахвяру зьбіваў з ног, ляжачага біў нагамі, а затым задушваў, наступіўшы нагой на шыю. Пасьля кожнага агляду 10-20 трупаў падбіралі і адпраўлялі іх у крэматорый.

- А калі наступіла вызваленьне?

- Яно прыйшло дзесятага сакавіка 1945 года ў 12 гадзін дня. Але ж да гэтага дня трэба было яшчэ дажыць. Пад выглядам эвакуацыі нас выгналі і пад узмоцненым канвоем павялі ў бок Балтыйскага мора. За некалькі дзён дарогі з двух тысяч засталося жывых усяго 347 чалавек, астатнія загінулі ў дарозе. Калі людзі амаль непрытомныя падалі, іх прыстрэльвалі. Нас, жывых, вызвалілі танкісты. А так загінулі б усе. Мы здагадваліся, што нас гоняць да мора, каб пасадзіць на баржы і ўтапіць.

Пасьля вызваленьня я вярнуўся дамоў, працаваў рабочым да выхаду на пеньсію. Тры гады як я стаў іваліідам другой групы.

- Міхаіл Міхайлавіч, а ці атрымалі Вы грашовую кампенсацыю?

- Атрымаў. Але якую? Жабрацкую. Па 30 марак у месяц. Гэта трохі больш аднаго працэнта, што атрымлівае зараз у Германіі маляр кожны месяц. Ці не насьмешка гэта? Яшчэ якая.

Гутарыў І.БАРЫСАЎ.

НА ЗДЫМКУ: М.М.КАРНІЛА.

Фота аўтара.

ДЭПУТАТЫ ПРАЦАВАЛІ ПЛЁННА, СТАРШЫНЯ І ЛІДЭР ЗАСТАЛІСЯ ЗАДАВОЛЕНЫМІ

27 красавіка адбылася апошняя сесія Гарадзенскага гарадзкога Савета дэпутатаў 21-скліканьня. Але ж народныя выбраньнікі ня вельмі сьпяшаліся (на момант яе пачатку ў зале паседжаньняў не хапала 8 дэпутатаў, неабходных для кворума), таму сесія пачалася прыкладна на паўгадзіны пазьней. Каб адцягнуць час, старшыня гарсавета Ф.Гудзей прапанаваў дэпутатам сфатаграфавацца на памяць, і яны не адмовіліся. Нарэшце прыйшлі іх калегі і ўсе заняліся справай.

Спачатку былі ўручаны пасьведчаньні і стужкі ганаровых грамадзян Горадні, а таксама падарункі тром ветэранам, якія былі ўдастоеныя гэтага званьня рашэньнем Савета на папярэдняй сесіі.

Затым дэпутаты заслухалі і прынялі да ведама інфармацыю намесьніка начальніка УУС В.Аўрамчыка аб выкананьні праграмы забесьпячэньня асабістай і маёмаснай бясьпекі грамадзян, прадухіленьня злачынстваў у Горадні (1991-1995 г.г.) Было адзначана, што з 73 пунктаў праграмы на сёньняшні дзень выкананы толькі 31.Так, напрыклад, па-ранейшаму горад дрэнна асьвятляецца ў цёмны час сутак, не ўстаноўлена дадатковая колькасьць тэлефонаў-аўтаматаў, а з тых, што маюцца, пазваніць у міліцыю, пажарную ахову і хуткую дапамогу можна толькі пры наяўнасьці загадзя набытых жэтонаў. Па гэтых і іншых прычынах колькасьць вулічных злачынстваў з 363 у 1990 годзе павялічылася да 540 ў мінулым. Аналагічная тэндэнцыя назіралася і ў першым квартале бягучага. Кіраўнікі прадпрыемстваў ігнаруюць рашэньні выканкамаў аб рэзерваваньні працоўных месц для непаўнагадовых (летась з 166 прадпрыемстваў толькі 6 выканалі ўстаноўленую квоту прыёму гэтай катэгорыі асоб), не вырашана праблема працаўладкаваньня школьнікаў на час летніх канікул. Як вынік, у 1990 годзе непаўнагадовымі было зьдзейсьнена 265 злачынстваў, а ў 1994 годзе - ужо 357. Увогуле ж колькасьць злачынстваў па лініі ўсіх служб міліцыі ўзрасла з 1681 ў 1990 годзе да 2687 ў мінулым. Ды і сёлета паляпшэньня крымінальнай сітуацыі чакаць не даводзіцца.

Шэраг дэпутатаў зрабілі заўвагу В.Аўрамчыку за паводзіны яго падначаленых, якія фармуюць ў людзей негатыўныя адносіны да міліцыі: міліцыянты на службовых машынах заяжджаюць на тратуары вуліц, спыняюцца пасярод дарогі, каб паразмаўляць са знаёмымі, ня робяць заўваг тым, хто на іх вачах засьмечвае горад.

З 1 траўня, згодна з рашэньнем сесіі, уведзены два мясцовыя зборы. Адзін прызначаны для кампенсацыі выдаткаў гарадзкога бюджэта на разьвіцьцё і добраўпарадкаваньне рэчавых рынкаў, іх транспартнае абслугоўваньне, рамонт і абслугоўваньне пад'яздных дарог, санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў. Цяпер за кожны дзень гандлю давядзецца плаціць пры рэалізацыі тавараў з рук і латкоў 5 працэнтаў мінімальнай зарплаты, з крытых навесаў - 10 працэнтаў, а з палатак і аўтамашын - 20 працэнтаў. Сродкі, атрыманыя ад другога збора, будуць накіроўвацца на набыцьцё адзінак гарадзкога пасажырскага транспарту агульнага карыстаньня, запчастак, абсталяваньня для капрамонту існуючых і будаўніцтва новых тралейбусных ліній, фінансаваньне капрамонту і падтрыманьне ў належным стане вуліц, плошчаў і іншых аб'ектаў гарадзкой гаспадаркі. Ён складзе 2 працэнты ад фонду аплаты працы прадпрыемстваў, філіялаў, арганізацый і ўстаноў незалежна ад форм уласнасьці за кошт прыбытку, які застаецца ў іх распараджэньні. Чытачы "Пагоні", верагодна, памятаюць, што з першага разу (на папярэдняй сесіі, якая адбылася 28 лютага) прапанова гарвыканкама аб увядзеньні гэтага збора не прайшла. Але ж дэпутаты , напэўна, зразумелі, што далей так жыць нельга. Бо за апошнія пяць гадоў толькі летась было набыта чатыры гарадзкіх аўтобуса і два тралейбуса. А толькі з 129 тралейбусаў 82 падлягаюць ліквідацыі. А грошай на набыцьцё новых транспартных сродкаў няма (адзін тралейбус каштуе 500 млн.рублёў, аўтобус - яшчэ болей). У амаль 300-тысячным горадзе 72 тысячы чалавек маюць правы на бясплатны, а яшчэ 67 тысяч - на ільготны праезд. І гарвыканкам ня мае магчымасьці дапамагчы транспартнікам, бо запазычанасьць бюджэта перад бюджэтнымі арганізацыямі і тымі, якія атрымліваюць з яго датацыі, складае 17 мільярдаў рублёў. А за кошт "транспартнага" збору да канца бюджэтнага года мяркуецца атрымаць прыкладна 12 мільярдаў рублёў.

Дэпутат Чычагаў узьняў на сесіі пытаньне неабходнасьці распрацоўкі праграмы ўтылізацыі і пераапрацоўкі другасных і прамысловых адкідаў (шкла, паперы, вырабаў з палімераў і іншых). Па яго словах, пры стварэньні належных умоў, у першую чаргу - ільгот у падаткаабкладаньні, знойдуцца і арганізацыі, і людзі, якія зоймуцца іх зборам, а шклозавод і завод "Белдругпалімір" ужо гатовы іх перапрацоўваць. Дэпутаты палічылі слушнымі прапановы свайго калегі і даручылі гарвыканкаму вывучыць узьнятае ім пытаньне і ўнесьці свае прапановы па яго вырашэньню на адну з бліжэйшых сесій Савета.

У павестцы дня сесіі было яшчэ прадстаўленьне пракурора аб дачы згоды Саветам на прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці дэпутата гарсавета А.Чыруна, які быццам бы ўчыніў 22 сакавіка ў кватэры сваёй былой жонкі скандал і нанёс ёй лёгкія цялесныя пашкоджаньні, а прыехаўшым міліцыянтам пагражаў нажом. Чырун назваў усе абвінавачаньні "враньём". І ці то калегі паверылі яму, ці то не жадалі пад канец дэпутацкай дзейнасьці псаваць яго лёс, але ж не далі згоды на прыцягненьне да адказнасьці.

Дэпутаты таксама заслухалі і прынялі да ведама інфармацыю намесьніка старшыні гарсавета Г.Пшанічнавай аб выкананьні наказаў выбаршчыкаў дэпутатамі гарадзкога Савета 21-га скліканьня. Як высьветлілася, з 140 наказаў 30 не выконваліся: ці з-за дэфіцыта сродкаў, ці з-за немэтазгоднасьці.

Завяршаючы сесію, старшыня Савета Ф.Гудзей і мэр горада выказалі пажаданьне, каб многія з іх увайшлі ў новы склад Савета.

А.ДУК.

СУМЕЖЖА

«БЕЛАРУШЧЫНА ТУТ НІКОЛІ НЕ БЫЛА САВЕЦКАЙ...»

Размова з галоўным рэдактарам віленскай газеты "Наша Ніва" сп.Сяргеям Дубаўцом

- У рэдакцыйнай зноcцы пазначана: "Наша Ніва", заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991 годзе. Якія традыцыі перанесены на старонкі сёньняшняй НН, як можна параўнаць гэтыя дзьве газеты, калі ўвогуле такое параўнаньне можа мець месца?

-"Наша Ніва" выходзіла ў Вільні з 1906 па 1915 год. Рэдакцыя дэкларавала, што газета павінна быць люстэркам жаданьняў і патрэбаў беларускай нацыі, якая тады імкліва дасьпявала і фармавалася. Пасьля ўсё гэта было спынена савецкім часам, ніхто ня думаў і ня дбаў пра гэтыя патрэбы і жаданьні, усе думалі пра пабудову камунізму і пра тое, каб хутчэй зьліць усе славянскія рэкі ў рускім моры. Пасьля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая, будзем прыблізна лічыць, скончылася ў 90-91 годзе, мы зноў вяртаемся ў той 1915 год, бо зноў нехта мусіць быць люстэркам жаданьняў і патрэбаў беларускай нацыі. І зноў у Вільні зьяўляецца, зноў беларуская, зноў газета, зноў "Наша Ніва".

- Ці чытач чакаў менавіта такую газету, бо давялося чуць меркаваньні, што НН - газета элітарная?

- Гэта абсалютна не элітарная газета, бо элітарная мае на ўвазе сьпецыяльную падрыхтоўку чытача, сьпецыяльную адукацыю, пэўную выкшталтаванасьць. Нашу газету прачытае любы дзядзька з вёскі, які калі-небудзь задумваўся над жыцьцём, яго праблемамі, калі яму знаёмы сам працэс мысьленьня. Ясна, што калі ён не задумваўся над гэтым і ўсё жыцьцё хадзіў ад станка да бутэлькі і ад бутэлькі да станка, дык можа гэта і не ягоная газета. Але гэта ня ёсьць народ. У нашай газеце няма нічога такога, што вымагала б сьпецыяльнай філасафічнай адукацыі. Мы газета, якая думае, таму мы ня ёсьць элітарная газета. Што тычыцца таго, ці чакаў чытач?.. Я, як рэдактар, чакаў такой газеты, і я яе зрабіў.

- Газета выходзіць цяпер штомесяц. Ці канцэпцыя штомесячніка захаваецца надалей?

- Безумоўна, што не захаваецца, бо закладзена канцэпцыя тыднёвіка. Калі гэта будзе? Тут ёсьць шмат праблемаў, якія трэба вырашаць.

- І якія гэта праблемы?

- Ставілася задача выехаць з Менску, дзе само культурнае магнітнае поле працятае камунізмам, дзе ўсё нацыянальнае дэфармавана савецчынай. Ставілася задача выехаць туды, дзе беларушчына ніколі не была савецкай, дзе яна мае шматвяковыя традыцыі, і там стварыць аснову заўтрашняга беларускага журналізму, пры чым самага шырокага, які ў Менску стварыць немагчыма. Мы прыяжджаем у Вільню, мы запачаткоўваем тут газету, мы выклікаем на супрацоўніцтва новых аўтараў, прычым з усёй Беларусі, бо далёка не адны сталічныя літаратары і навукоўцы друкуюцца ў нас, ёсьць і віленскія аўтары, і аўтары з-за акіяну. Але нас цікавіць найперш тое, што адбываецца ў Беларусі. І на сёньняшні дзень у нас ёсьць з паўсотні сталых падпісчыкаў. Такім чынам, мы маем адпрацаваным увесь механізм і застаецца адно - узбуйніць рэдакцыю, перавясьці яе ў рытм штотыднёвай працы.

- Вы сказалі - ставілася задача выехаць з Менску. І хто выехаў? Інакш кажучы, хто на сёньняшні дзень робіць газету?

- Акрамя рэдактара ёсьць мастацкі рэдактар, які займаецца ўсім афармленьнем; ёсьць адказны сакратар - гэты чалавек у Менску зьвязаны на ўсіх фабрыках, займаецца распаўсюджаньнем, падпіскай; ёсьць наборшчык; ёсьць чалавек, які робіць макет. У прынцыпе, для месячніка большага штата не патрэбна. Мы пасьпаваем з той масай тэкстаў: адбіраем іх і генерыруем пэўныя ідэі. Ёсьць у нас яшчэ стыль-рэдактар, які робіць канчатковую чыставую вычытку, бо тэксты мусяць быць падрыхтаванымі максімальна прафесійна, і на сёньня гэта наш галоўны козыр на беларускім прэсавым рынку. Уся без выключэньня прэса грашыць тым, што тэксты размазаныя, неакцэнтаваныя, не выверены жанр і г.д.

- Адзін нумар Н.Н. быў выдадзены лацінкай. Чаму?

- У Беларусі няма палемікі наконт таго, ці пісаць кірыліцай ці лацінкай. Раздаюцца час ад часу галасы, што лацінкай. Тым ня менш, усе выданьні выходзяць кірыліцай. Для таго, каб справакаваць такую палеміку, трэба было даць людзям, якія зьяўляюцца прыхільнікамі лацінкі, сучаснае выданьне, зробленае цалкам лацінкай. Магчыма, некаторыя самі адмовіліся ад гэтай ідэі пасьля таго, як атрымалі такое выданьне. Магчыма, умацаваліся ў сваёй ідэі, атрымаўшы аргумант, што такое сучасная беларуская газета, выдадзеная цалкам лацінкай. Апеляцыі да колішніх даваенных друкаў на жоўтай паперы, набраных рэтрашрыфтамі, - гэта рэтрааргумантацыя. Выдаючы сёньня НН лацінкай і кірыліцай, мы задаволілі б толькі некалькі дзесяткаў чалавек, а выдаткі былі б неапраўдана вялікімі. Хоць трэба сказаць, што той нумар, які выйшаў лацінкай, быў раскуплены літаральна за паўдня, яго куплялі па некалькі асобнікаў. Гэта якраз той выпадак, што куплялі, як аргумант за лацінку.

- А ці ёсьць нейкія афіцыйныя вынікі: лацінка ці кірыліца?

- Рэч у тым, што няма палемікі, няма галасоў у друку. Недзе разы два на месяц мы атрымліваем лісты з просьбамі і патрабаваньнямі друкавацца далей лацінкай. Але гэта трошкі ня тая праблема, якая нас цікавіць. Нам цікавая даходлівасьць тэкстаў. Калі мы пададзім іх, хай у іх нават і закладзеныя складаныя думкі, яшчэ і лацінкай, то мы адрэжам ад сябе чытача. Я думаю, што калі ідэя лацінкі жыцьцяздольная і перспектыўная, яна дасьпее да самастойнага выданьня. Ва ўгоду ж форме мы ня хочам страчваць у зьмесьце.

- У наступным годзе прыпадае 90-годдзе выхаду ў сьвет першага нумара НН, а таксама 5-годдзе аднаўленай "Нашай Нівы". Як будуць адзначацца гэтыя даты?

- Я думаю, што ніяк. Нам цікавей зрабіць больш дасканалую газету, чым займацца арганізацыяй нейкіх сьвятаў. Газета мусіць разьвівацца, сцьвярджацца. Калі камусьці трэба адзначаць яе юбілей, няхай ён гэтым і займаецца. Для нас гэта лішняя трата часу.

Гутарыў Уладзіслаў **СТРУМІЛА**.

«РУРГАЗ» ЖАДАЕ ФІНАНСАВАЦЬ БУДАЎНІЦТВА ГАЗАПРАВОДА НА БЕЛАРУСКАЙ ТЭРЫТОРЫІ

Каментуючы ўдзел Беларусі ў праэкце пракладкі газаправоду "Ямал-Заходняя Эўропа", генеральны дырэктар Белдзяржпрадпрыемства па транспарціроўцы і пастаўцы газу Мікалай Мачэрнюк заявіў, што будаўніцтва павінна распачацца ўжо ў гэтым годзе. Агульная даўжыня газаправоду па тэрыторыі Беларусі складзе 600 кіламетраў. Сёлета плануецца пракласьці 209 кіламетраў ад Нясьвіжа да польскай мяжы. Па словах Мачэрнюка, да 2010 года пры пасьляховай рэалізацыі праэкта Беларусь зможа спажываць да 30 мільярдаў кубаметраў газу, пры тым, што зараз Беларусь спажывае 14,5 мільярдаў кубаметраў. Транзіт праз рэспубліку павялічыцца ў тры разы. Аднак, як заявіў спадар Мачэрнюк, фінансаваньне пракладкі беларускай часткі газапровода плануе ўзяць на сябе расейскае АТ "Газпрам". Пры гэтым Беларусь ня здолее браць плату за транзіт па сваёй тэрыторыі ў поўным аб'ёме, бо сам газапровад будзе належаць Расеі. Беларусь будзе вымушана задаволіцца падаткамі за выкарыстаньне зямлі і платай за тэхнічнае абслугоўваньне газапровода. Між тым, расейскі бок заяўляе, што ня будзе супраць укладаньня Беларусьсю сродкаў у фінансаваньне будаўніцтва газапровода. Мікалай Мачэрнюк ня выключыў, што пад гэтыя патрэбы Беларусь возьме крэдыт.

Як стала вядома, узяць удзел у фінансаваньні беларускай часткі праэкта гатова нямецкая кампанія "Рургаз". Гэту інфармацыю пацьвердзіў і сам Мачэрнюк, паведаміўшы, што "Белтрансгаз" ужо вядзе перамовы з Нямеччынай.

СІМ

ПАДЧАС ВІЗІТУ ОЛДЗІНГА-СМІ ПЫТАНЬНІ КРЭДЫТАЎ МВФ АБМЯРКОЎВАЦЦА НЯ БУДУЦЬ

Як стала вядома, намечаны напрыканцы красавіка візіт на Беларусь дырэктара 2-га Эўрапейскага ўпраўленьня МВФ Джона Олдзінга-Сьмі перанесены на 9-11 траўня. Падчас візіту спадар Олдзінг-Сьмі правядзе шэраг сустрэч у Кабінеце Міністраў Беларусі з мэтай высьвятленьня мэтазгоднасьці прыбыцьця місіі МВФ ў Менск. У прадстаўніцтве МВФ на Беларусі карэспандэнту паведамілі, што падчас візіту Олдзінга-Сьмі пытаньні прадстаўленьня крэдытаў МВФ Беларусі абмяркоўвацца ня будуць.

СІМ

УКРАІНА

КІЕЎ

"Неабходна стварыць на Украіне Рэвалюцыйна-Дэмакратычную Партыю", - лічыць кіраўніцтва Днепрапетроўскай грамадзкай арганізацыі "Антымафія". Аб гэтым гаворыцца ў распаўсюджанай 30 красавіка заяве кіраўніцтвам "Антымафіі". Галоўная задача Рэвалюцыйна-Дэмакратычнай Партыі - гэта барацьба з мафіяй і блізказьвязанымі з ёй праваахоўчымі органамі. Кіраўніцтва "Антымафіі" перакананa, што шосты аддзел па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю МУС Украіны садзейнічае замацаваньню мафіёзных структур і паступова зжываецца з імі.

ХАРКАЎ

Забараніць тэрміновую службу ва ўнутраных, чыгуначных і інжынерна-будаўнічых вайсках патрабуюць ад кіраўніцтва ўзброеных сіл Украіны члены Харкаўскага абласнога Саюза салдацкіх маці. Адпаведная рэзалюцыя Саюзу салдацкіх маці распаўсюджана па ўсіх рэгіянальных аддзелах. Аўтаркі рэзалюцыі патрабуюць павялічыць грашовую кампенсацыю бацькам загінуўшых у войску жаўнераў.

"Э-Х"

ВЕТСКІ З ПОЛЬШЧЫ

Члены польска-летувіскай гаспадарчай палаты стварылі ў Беластоку Агенцтва Эўраразьвіцьця Усход-Захад.

Суполка будзе весьці гаспадарчую дзейнасьць, сутнасьць якой, між іншым, будзе ў стварэньні сеткі складаў ды крамаў па абодвух баках польска-летувіскай мяжы, арганізацыі выставаў, спраўджаньні вераГоднасьці бакоў, падпісаўшых эканамічныя кантракты, арганізацыі турыстычнай дзейнасьці, а таксама страхаваньня.

* * *

У Варшаве адбылося сьвяткаваньне 50-й гадавіны вызваленьня вязьняў гітлераўскіх канцэнтрацыйных лагераў.

Урачыстасьці прайшлі ў сталіцы, бо тут жыве большасьць былых вязьняў, якія, зважаючы на свой узрост, ня ў стане ехаць на тэрыторыю лагераў.

Сьвяткаваньне адкрыла экуменічнае набажэнства ў варшаўскім касьцёле Сьв.Крыжа. Потым былыя вязьні і прадстаўнікі ўладаў усклалі кветкі на павонзкаўскіх могілках перад маўзалеем замардаваных у канцэнтрацыйных лагерах.

У нядзелю, 30 красавіка, адбылося жалобнае набажэнтва ў Варшаўскай сінагозе. На наступны дзень былыя вязьні наведалі ў Варшаве месцы, зьвязаныя з барацьбой ды пакутніцтвам палякаў і габрэяў.

* * *

Паводле паведамленьня Галоўнага Статыстычнага Ведамства, на працягу апошніх трох месяцаў адбыўся ўзрост прамысловай прадукцыі ды замежнага гандлёвага абароту.

Сёньня беспрацоўных у Польшчы на 80 тысяч менш, чым у сьнежні 1994 года, і на 200 тысяч асобаў менш у параўнаньні з адпаведным перыядам мінулага года.

Рашуча негатыўнай зьявай у першым квартале гэтага года быў узрост цэнаў на тавары і паслугі. У сакавіку яны былі на 8 працэнтаў вышэйшыя, чым у сьнежні мінулага года. Найбольш узрасьлі цэны на прадукты харчаваньня.

На думку старшыні Галоўнага Статыстычнага Ведамства Рамана Савінскага, вынікам росту цэн у першым квартале будзе перакрочваньне планаванага на гэты год 17-працэнтнага узроўню інфляцыі. На ягоную думку, гэта непазьбежна, нават калі б да канца года ўсе цэны фармаваліся згодна з планам, прадстаўленым у законе пра бюджэт.

* * *

Ад гэтага году чужаземцы, якія імкнуцца атрымаць права працаваць дактарамі, будуць абавязаныя здаць сьпецыяльна арганізаваны экзамен, які мае пацьвердзіць іх веданьне неабходных законаў. Гэты абавязак не датычыць чужаземцаў, якія скончылі медыцынскія навучальныя ўстановы ў Польшчы, альбо прайшлі ў Польшчы сьпецыяльны стаж.

Згодна з новым законам, ваявода горада Познань прыняў рашэньне зачыніць прыватны шпіталь "Карвіта", дзе нелегальна працавалі расейскія акулісты з Краснадарскага інстытуту.

* * *

88 іконаў ды памятны каштоўны крыж, вартасьцю 30 тысяч новых злотых, перададзены ў беластоцкі акруговы музей мясцовай мытняй.

Творы мастацтва былі канфіскаваныя на польска-летувіскіх ды польска-беларускіх мытных пераходах, вывозілі іх у Расею пераважна грамадзяне Летувы і Расеі.

* * *

У Непакалянаве (каля Варшавы) ды ў самой сталіцы адбудзецца юбілейны 10 Фестываль каталіцкіх фільмаў.

У фестывалі ўдзельнічала 176 фільмаў з 16 краін Эўропы, Азіі, Паўночнай Амерыкі і з Аўстраліі.

Старшыня Рады Каталіцкіх Рухаў ксёндз Адам Шульц адзначыў, што Фестываль каталіцкіх фільмаў прапануе новыя формы набліжэньня людзей да Евангельля.

А.АЙНА.

ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ЗА ГАЗ, МАГЧЫМА, АПЛОЦІЦЦА АКЦЫЯМІ БЕЛАРУСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

На прэс-канферэнцыі, прысьвечанай праблемам забесьпячэньня Беларусі энерганосьбітамі, міністр энергетыкі рэспублікі Валянцін Герасімаў заявіў: "Нягледзячы на дырэктыўныя пастановы ўрада і ўказы прэзідэнта, Беларусь знаходзіцца ў глыбокім крызісе неплацяжоў". Аргументуючы згаданае, спадар Герасімаў заявіў, што ў студзені гэтага года ўзровень плацяжоў за расейскія энерганосьбіты склаў 78%, у лютым - 84%, у сакавіку - 94%, а ў красавіку - 55%. Агульная лічба запазычанасьці па энерганосьбітах складае звыш 3,5 трыльёнаў беларускіх рублёў, прычым 60% гэтай сумы прыходзіцца на 1994 год, а 40% - на 1995. Каментуючы ліст прэм'ер-міністра Расеі В.Чарнамырдзіна, атрыманы на днях у беларускім Кабінеце Міністраў, В.Герасімаў паведаміў, што ў ім ёсьць патрабаваньне аплаціць запазычанасьць Беларусі расейскаму акцыянернаму таварыству "Газпрам", якая складае на сёньняшні дзень 409 мільёнаў долараў. У мэтах пагашэньня гэтай сумы пры ўрадзе створана сумесная беларуска-расейская камісія, якая займаецца варыянтамі выплаты запазычанасьці. Адным з магчымых варыянтаў спадар Герасімаў назваў пагашэньне акцыямі беларускіх прадпрыемстваў. "У выпадку, калі беларускі бок не пераканае расейскі бок адтэрмінаваць выплату запазычанасьці і ня будзе стопрацэнтна пагашаць бягучыя пастаўкі газу, то расейцы пагражаюць перакрыць падачу газу ў Беларусь", - заявіў міністр.

СІМ



ДЫК ЯКУЮ ПЕРАМОГУ БУДЗЕМ ХУТКА АДЗНАЧАЦЬ: У «ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ», ЦІ ДРУГОЙ СУСЬВЕТНАЙ?

Нядаўна па беларускаму радыё ішла перадача "На хвалі часу". Перадача характэрная тым, што вядучыя запрашаюць выступоўца па нейкаму пытаньню, а слухачы радыё маюць права задаваць тэлефанічныя пытаньні на тэму, якая абмяркоўваецца.

Аўтар гэтай зацемкі вельмі ўважліва слухаў выступленьне ветэрана аб 1418 днях змаганьня з фашыстамі, аб вялікіх стратах, асабліва беларускага народа, у гэтай барацьбе. Усё ішло па сцэнару, вядомаму ўжо дзесяцігоддзі: і барацьба цяжкая, страты і разбурэньні вялікія, перамога дасталася вялікаю крывёю. Увагу падчас прамовы ветэрана прыцягнуў тэлефонны званок слухача, размова з якім таксама ішла ў эфір.

Слухач, ня ведаю нават з якога горада, ці сяла, але безумоўна з Заходняй Беларусі, нечакана для вядучай праграмы і ветэрана спытаў: "А што гэта вы ўсё гутарку вядзеце аб "Вялікай Айчыннай". Мой бацька ваяваў з немцамі ўжо ў 1939 годзе, тады многія гарады Беларусі бамбілі, і ня толькі немцы".

Вядучая праграмы разгубілася ад такога пытаньня і не прыдумала нічога іншага, як выдаць у эфір наступны экспромт: "У 1939 годзе з немцамі змагалася невялікая частка нашага народа, а ў Вялікай Айчыннай удзельнічала ўсё насельніцтва нашай рэспублікі, таму беларускі народ адзначае перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне!"

Такая заява досыць дзіўная для сродкаў масавай інфармацыі незалежнай дзяржавы, у якой павінна выкладацца гісторыя свайго народа і якую ня трэба "дапасоўваць" да гісторыі суседа. Чаму мы, так як і рускія, павінны лічыць пачаткам змаганьня з немцамі 1941 год? Нашы бацькі пачалі ваяваць з імі амаль на два гады раней? Чаму мы павінны казаць толькі аб Вялікай Айчыннай, калі шмат нашых землякоў змагалася ў Паўночнай Афрыцы, Італіі зусім не за перамогу Сталіна - хаўрусьніка Гітлера ў барацьбе супраць заходняй дэмаркацыі?

Дык чаму і зараз бальшавіцкія прапагандысты, якія вядуць рэй у падрыхтоўцы сьвята Перамогі, так ня любяць успамінаць аб пачатку другой сусьветнай вайны, калі яны разам з гітлераўцамі арганізавалі "парад перамогі" над Польшчай у Берасьці, над краінай, якая першай паднялася супраць гітлераўскай агрэсіі і супраць якой савецкая дзяржава адкрыла "другі фронт"?

Многія нашыя публіцысты пішуць аб вызваленьні заходняй Беларусі ад польскіх паноў і ў той жа час параўноўваюць лагер у Бярозе Картузскай і Сталінскія лагеры, забываючы аб тым, што канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузскай быў створаны толькі ў 1934 годзе, калі ўжо шмат беларускай інтэлігенцыі было вынішчана ва ўсходняй, савецкай частцы Беларусі. Да таго ж, ня трэба забываць, што супраць маладой, незалежнай дзяржавы, якая мела з Саветамі Рыжскі мірны дагавор, вялася сапраўдная дыверсійная вайна такімі вядомымі тэрарыстамі, як Арлоўскі, Ваўпшасаў, Корж. Каманьдзіры Чырвонай Арміі, працаваўшыя ў сьпецыяльна створаным саветамі вайсковым падразьдзяленьні, займаліся сапраўдным тэрорам у суседняй дзяржаве, каб дэстабілізаваць палітычную абстаноўку, падбівалі сялян да бунту супраць існуючай улады, забівалі мірных жыхароў (паноў), афіцэраў, паліцыянтаў.

Што рабіць з удзельнікамі такіх дыверсійных груп? Даваць два гады ўмоўнага зьняволеньня, як гэта робіцца зараз? Між тым, польскіх дыверсійных груп у БССР не было! Больш таго, навошта забываюць аб тым, што дэпутат сейма Браніслаў Тарашкевіч заклікаў да ўтварэньня рабоча-сялянскага ўраду, гэта значыць дзейнічаў на карысьць суседняй дзяржавы, і хто ня хоча душыцеляў-катаў і грабароў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, хто ня хоча арганізатараў вайны супраць СССР і паняволеньня БССР, - той ніколі ня пойдзе на самагубства і ніколі ня будзе галасаваць за Беларускую фашыстоўскую... банду "Цэнтрасаюзу" N 22. (Гэта заклікі Б.Тарашкевіча, пасла польскага сейму. Што, яны былі на карысьць сваёй дзяржавы, ці чужой?)

І вось палякі асудзілі яго на 12 гадоў турмы (не забывайма, што бальшавікі судзілі на 25 гадоў зьняволеньня шэрагавага, малалетняга сябра СБМ!), а пасьля абмянялі на беларускага пісьменьніка Аляхновіча. І як адудзячыліся "сябры па класу" правадыру пралетарскай ідэалогіі ў Польшчы Браніславу Тарашкевічу? Калі ён стаў непатрэбным, яго расстралялі. Дык хто быў больш жорсткі ў адносінах да беларускай інтэлігенцыі? Хто больш зьдзекваўся?

Я ўжо не кажу пра тое, што пражываньне значнай часткі беларусаў па-за межамі сталінскай дзяржавы,выратавала нас ад штучна выкліканага голаду ў СССР у 1933 годзе, ад прымусовай калектывізацыі! Да таго ж ня толькі беларускі, ці ўкраінскі народы былі падзелены межамі на дзьве часткі і жылі ў розных дзяржавах. Возьмем для прыкладу Арменію. Большая частка армян жыла ў Турцы, прычым падчас першай сусьветнай вайны туркі ўчынілі армянам сапраўдны генацыд, зьнішчыўшы 15 млн.армян. Там зьнішчылі людзей значна больш, чым пражывала на тэрыторыях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны разам узятых. І тым ня менш, Сталін не сьпяшаўся вызваляць паўднёвых армян ад туркаў. Так сама, як не пачаў вызваляць іранскіх азербайджанцаў. А вось нас, заходніх беларусаў, ён вырашыў "вызваліць", і менавіта тады, калі Польшча распачала барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць з найстрашэйшым ворагам чалавецтва - нямецкім фашызмам.

Былы вайсковы выведвальнік савецкай ГРУ Віктар Рэзун, які выступае пад псеўданімам Віктара Суворава, піша аб гэтым так: "Вонкі ўсё здаецца нараўне: частка Польшчы - Гітлеру, частка Польшчы - Сталіну. Аднак ужо праз тыдзень пасьля падпісаньня пагадненьня (пакта) Молатава-Рыбентропа Сталін першы раз пазьдзекваўся над Гітлерам. Гітлер пачаў вайну супраць Польшчы, а Сталін заявіў, што яго войска яшчэ не гатова да ваенных дзеяньняў. Ён мог бы сказаць аб гэтым Рыбентрпу перад падпісаньнем дагавору, але ён не зрабіў гэтага. Гітлер распачаў вайну і аказаўся адзінокім.

Вось і першы вынік для Гітлера: ён, і толькі ён, вінаваты ў развязваньні другой сусьветнай вайны".

І далей чытаем: "Польшчу дзялілі не ў імперскай канцылярыі Гітлера, а ў Крамлі. Гітлер пры гэтым не прысутнічаў, прысутнічаў Сталін. Але вінаваты ў разьвязваньні вайны Гітлер, а Сталін - не. Сталін - нявінная ахвяра. Сталін - вызваліцель Усходняй Эўропы.

Войскі Сталіна вытваралі на тэрыторыі Польшчы такія самыя, а можа і большыя зьдзекі і праступствы, але па нейкай прычыне Захад не аб'явіў яму вайны". (Віктар Сувораў "Ледакол", Масква, Выдавецкі дом "Новое время". 1993 г., ст. 42-43, пераклад на беларускую мову - А.Б.)

Да сказанага Суворавым ад сябе дадам, што даваенны ўрад Польшчы таксама не згадаўся аб'явіць СССР вайну пасьля таго, як Чырвоная Армія парушыла 17 верасьня 1939 года Рыжскі дагавор. Гэткая нядбайнасьць былога ўраду не паставіла ў прававаых адносінах на адну ступень адказнасьці Гітлера і Сталіна за напад. Адсутнасьць такога дакумента дазволіла пасьля Сталіну разыграць ролю вызваліцеля Польшчы.

Скончым гэтую гаворку наступнай цытатай з "Ледакола": "Канчаткова Польшча, дзеля свабоды якой захад і ўступіў у вайну (з Нямеччынай - А.Б.), свабоды не атрымала, а была адданая ў няволю Сталіну, разам з усёй Усходняй Эўропай, у тым ліку і з часткаю Нямеччыны. Пры ўсім гэтым некаторыя жыхары Захаду і далей вераць у тое, што яны былі пераможцамі ў другой сусьветнай вайне (больш зьедліва ня скажаш! - А.Б.).

У выніку, Гітлер пакончыў самагубствам, а Сталін застаўся бязьмежным уладаром вялізнай антызаходняй імперыі, створанай з дапамогаю Захаду (колькі балючага сарказму ў гэтых словах, але ж гэта праўда! Ялцінская канферэнцыя - гэта продаж усходняй Эўропы бальшавікам - А.Б.).

Пры ўсім гэтым Сталін змог захаваць рэпутацыю наіўнага даверлівага прастачка, а Гітлер увайшоў у гісторыю як злыдзень!

На Захадзе выдадзена мноства кніг з ідэяю: Сталін ня быў належна падрыхтаваны, а Гітлер быў гатовы ваяваць.

А на мой погляд да вайны падрыхтаваны ня той, хто аб гэтым моцна крычыць, а той, хто яе выйграў, разьдзяліўшы сваіх ворагаў і сутыкнуўшы іх ілбамі аднаго з другім". (там жа, стар.43)



Я, як аўтар гэтага артыкула, магу пацьвердзіць, што зранку 17 верасьня 1939 года на мястэчка Гародзяй быў налёт. Усе думалі, што гэта налёт нямецкіх самалётаў, якія бамбілі чыгунку ў выемцы ля сучаснага прыпынку "Ліпа", бамбілі кароў, якія пасьвіліся на балотах ля рэчкі Вуша каля вёскі Студзёнкі. Але мой бацька, які працаваў на чыгунцы ў гэтых мясьцінах, прынёс пад вечар асколкі з тых бомбаў, на якіх стаялі рускія літары (кірыліцай). І бацька ўсё ня мог супакоіцца, чаму трэба было бамбіць пастухоў на балоце, вызваляючы беларусаў ад польскіх "паноў"? Няўжо лётуны ня бачылі, што стада кароў - гэта ня войска? І вырашылі мы тады, што бомбы кацілiся куды папала абы выклікаць паніку. Ці па-брацку гэта?

Многа за апошнія 50 год гаворыцца аб тым, што нямецкія войскі напалі на СССР зьнянацку, нечакана, таму вораг атрымаў напачатку вайны вялікую перавагу. Мне давялося працаваць у 1955 годзе разам з былым начальнікам штаба дывізіі, якая перад 1941 годам мела дыслакацыю ў Ломжы. Дык вось ён расказваў,як ён завальваў Менск (Паўлава) дадзенымі зьнешняй разведкі аб падрыхтоўцы немцаў да вайны. А адказ быў адзіны: "Самастойна нічога не прадпрымаць!", "Не паддавацца на правакацыі!", "Праяўляць вытрымку!". Калі ж вытрымка Панасенку давяла да нямецкага палону, тады яго "узнагародзілі" дзесяцьцю гадамі лагеру "за здраду Радзіме".

Сёньня беларускія камуністы ахвотна друкуюць здымкі з часоў акупацыі, дзе побач з беларускімі сьцягамі красуюцца сьцягі нямецкія.

Гэта павінна сьведчыць аб тым, па іх задуме, што нацыянальны беларускі сьцяг - гэта сьцяг калабарантаў, здраднікаў, памагатых немцаў. А мо першымі памагатымі немцаў былі ўсё ж Сталін і Молатаў, якія забясьпечвалі нямецкае войска хлебам, салам ды бяньзінам, каб немцам было лягчэй распраўляцца з Францыяй, Англіяй, якія з немцамі ваявалі, а СССР немцам дапамагаў змагацца супраць іх.

Са слоў маёй стрыечнай сястры ведаю, што нават 21 чэрвеня 1941 года з Баранавіч Цэнтральных у накірунку Нямеччыны былі адпраўлены два саставы (цягнікі) цыстэрнаў з бяньзінам. І гэта пры тым, што не толькі Чэрчыль, але і Рыхард Зорге папярэджвалі аб пачатку нямецка-савецкай вайны 22 чэрвеня! Але ў Сталіна давер да хаўрусьніка-Гітлера быў большы, чым да разведчыкаў, што рызыкавалі жыцьцём. І хто пасьля гэтага мае маральнае права вінаваціць юнакоў СБМ, жаўнераў БКА ў паслуганстве немцу?

Зрэшты, калі б Сталін сапраўды быў выдатным палітыкам і разьлічваў усё, як у шахматах, хаця б на тры хады наперад, дык нечаканага нападу зьнянацку ніяк не магло б адбыцца. Бо сама гісторыя пасьля першай сусьветнай вайны паклапацілася аб тым, каб два агрэсары, два дыктатары ня мелі супольнай мяжы. Паміж Нямеччынай і СССР быў санітарны кардон малых самастойных дзяржаў. І, калі Сталін не хацеў, каб на яго напалі зьнянацку, трэба было гэты кардон незалежных дзяржаў захаваць і нават умацоўваць яго. Што ж робіць "вялікі стратэг"? Ён гэты санітарны кардон разбурае, каб мець агульную мяжу з Гітлерам ня толькі па Бугу, але і з Усходняй Прусіяй у Летуве. А нораў Гітлера быў вядомы: ён нападаў на ўсіх без паведамленьня вайны, ён усюды выкарыстоўваў фактар нечаканасьці - і ў Польшчы, і ў Нарвегіі, і ў Бельгіі. Бальшавікі цешыліся, калі польская авіяцыя была спаленая прама на аэрадромах і не падумалі аб тым, што падобны лёс можа чакаць іх собскія аэрадромы.

Упамянуты вышэй Віктар Сувораў напісаў у сваім аналізе: "Краіны Усходняй Эўропы былі натуральнымі саюзьнікамі СССР. З імі трэба было шукаць хаўрусу супраць Гітлера. Але Сталін такога хаўрусу не шукаў... Сталін мог бы заставацца нейтральным (у другой сусьветнай вайне - А.Б.), але ён замест гэтага біў сякераю ў сьпіну тым, хто супраць фашызму ваяваў" ("Ледакол", стар.38).

Ад сябе дадам, што ён гэтым дапамагаў Гітлеру, пакуль той не вырашыў "аддзячыць" за дапамогу.

Вось чаму бальшавіцкія ідэолагі так ня любяць успамінаць пачатак другой сусьветнай вайны! І я сапраўды сустракаў у Расеі досыць адукаваных людзей, якія былі ўпэўненыя, што барацьба з фашызмам ва ўсім сьвеце пачалася толькі пасьля нападу Гітлера на СССР. Вайну з Польшчай яны лічылі лакальнаю, калі пасьля 17 дзён змаганьня ў Эўропе настаў мір да чэрвеня 1941 года. І так думалі не якія-небудзь невукі. Так убілі ім у галовы бальшавіцкія прапагандысты. А нам зараз нашто паўтараць гэтую хлусьню? Мо настала пара праўдзіва расказваць аб усім, што адбывалася ад 1 верасьня 1939 года да 8 траўня 1945 года, за 2076 дзён вайны.

А.БАХАНЧЫК



Праграма тэлеперадач

Панядзелак, 8 траўня

Белорусское телевидение

8.00 "Поле памяти." Док. фильм. 8.30 "Сивограк". Телеспектакль. 9.35 К 50-летию Победы. Концерт учащихся музыкальной школы N 10 г.Минска. 2-е отделение. 10.25 Здоровье. Тележурнал. 10.50 Концерт ансамбля "Память сердца". 11.25 "Майские звезды". Худ. фильм. 12.55 Живая история. Браславские легенды. 13.10 "Музыканты военные". Оркестру Министерства обороны Республики Беларусь - 45 лет. 14.10 Портрет в интерьере. Директор Музея Великой Отечественной войны А.И.Ульянович. 14.30 К 50-летию Победы. Архивариус. По страницам фильма-концерта "Родные напевы"(1948 г.). 15.05 Студия "Эксклюзив". Адвокат. Льготы для ветеранов. Прямая линия. 15.45 "Крок". "Пять звезд". Телеигра. 17.05 Тайны мира. "Экспедиция". Научно-популярный сериал. 17.40 Между нами, женщинами. 18.10 Проспект. Информационно-аналитическая программа. 18.40 Ток-шоу "Карамболь". Праздничный выпуск. 19.10 К 50-летию Победы. Телевизионный Дом кино. 1 Республиканский фестиваль "Поют актеры театра и кино". 20.00 Новости. 20.40 Колыбельная. 21.00 Праздник Победы - праздник города. Трансляция с Минского стадиона "Динамо". 0.05 Гандбол. Чемпионат мира. Беларусь - Швеция. 1.20 Под куполом Вселенной.

1 канал

5.00 Телеутро. 8.00, 14.10, 22.10 Новости. 8.20 "Секреты моего лета". Телесериал для детей (Канада). 1-я серия. 8.45 Мультфильм. 8.55 Возложение венков к могиле Неизвестного солдата. 9.30 Эх, путь-дорожка фронтовая... 9.40, 10.55, 14.30, 15.05, 18.05, 19.40, 20.40 Непобедимые. 9.45 Здоровье. 10.10 Утренняя почта. 10.40 Смак. 11.00 Открытие памятника маршалу Г.К.Жукову. 11.45 "Повесть о настоящем человеке". Худ. фильм. 13.30 Горькая судьба победителя. Авторская программа Э.Рязанова. 14.35 Гол. 15.10 Бокс. Чемпионат мира. 15.50 Счастливый случай. 16.35 В эти дни 50 лет назад. 16.55 Торжественное собрание, посвященное 50-летию Победы в Великой Отечественной войне. 18.10 "Родная кровь". Худ. фильм. 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.45 Мы. Авторская программа В.Познера. 21.25 Бокс. Чемпионат мира. 22.30 Всемирный концерт свободы, посвященный 50-летию Победы.

Канал "Россия"

7.00, 13.00, 22.00 Вести. 7.20 Звезды говорят. 7.30 Победители. 8.00 Репортажи с мест. 8.15 "В тот день, поздней осенью". Док.фильм. 8.55 Возложение венков к могиле Неизвестного солдата. 9.30 "Кино нашего детства". Док.фильм. 10.25 "В честь пятидесятилетия мира в Европе". Трансляция празднования Дня Победы в Париже. 10.55 "Великому полководцу". Открытие памятника маршалу Г.К.Жукову. 11.45 "На честном слове и на одном крыле". Музыкальная программа. 12.05 Никто не забыт. 12.10 "К-2" представляет: "Фрак народа". 13.20 Де факто. 13.35 Белая ворона. 14.20 "Был месяц май". А.Баталов. 14.35 Устами младенца. 15.05 "Весна". Худ.фильм. 16.50 Видеопоэзия. А.Твардовский. 17.00 "Великий подвиг народа". Торжественная встреча и концерт, посвященные 50-летию Победы в Великой Отечественной войне. В перерыве - Вести. 20.00 Поет К.Шульженко. 20.10 L-клуб. 21.00 Без ретуши. В пресс-центре "Республика" писатель Григорий Бакланов. 22.40 Река времени. 22.45 Автомиг. 22.50 Кинофестиваль "День Победы". "Случай с Полыниным". Худ. фильм.

Санкт-Петербург

7.00 Доброе утро. 9.00 Венно-морской парад кораблей стран антигитлеровской коалиции и водно-спортивный праздник. 9.30 "Второй фронт". Премьера телефильма. 10.05 "На пути в Берлин". Худ. фильм. 11.35 П. Честноков. "Панихида". 12.20 "9 мая". Премьера короткометражного худ. фильма. 12.50 "Вас приглашает Клавдия Шульженко". Фильм-концерт. 13.55 Неизвестная блокада. 14.25 Крестики-нолики. 15.00 Футбол. Чемпионат России. "Зенит"(СПБ)-"Факел"(Воронеж). 16.45 Студия "Вообрази". 17.00 "Антре". Цирковая программа. 17.45 Репортаж о военно-морском параде в Санкт-Петербурге. 18.10 Большой фестиваль. 18.30, 21.40 Информ ТВ. 18.50 "Небесный тихоход". Худ.фильм. 20.05 Фестиваль "Балтийский дом". 20.40 "Юнга, матрос, артист". Герман Орлов. 21.10 Молодежь - ветеранам. 22.00 Дневник спартакиады. 22.30 "20 дней без войны". Худ.фильм. 0.05 "Призраки". Телеспектакль.

Польша - 1

07 50 Программа дня. 07 55 Документальный фильм. 09 05 "Доктор Квинн". Сериал пр-ва США. 09 50 Новости. 10 00 Трансляция торжественного заседания народного собрания. 10 50 Мультфильм. 11 15 Молодежная поэтическая студия. 11 45 Будем друзьями. 12 00 Трансляция торжественного богосуженния. 13 35 Концерт. 14 00 Когда закончилась II мировая война. 14 15 Теледиски. 14 50 "Операция у арсенала". Фильм пр-ва Польши. 16 25 Документальный фильм. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 "Как перехитрить мафию". Коддия пр-ва США. 19 55 Вечеринка. 20 15 Новости. 20 55 Трансляция торжеству могилы неизвестного солдатта. 22 30 "Шталаг Люфт". Фильм пр-ва Англии. 00 15 Новости. 00 55 Зимний полет мотылька. 01 05 Развлекательная программа.

Польша - 2

08 00 Играют военные оркестры. 08 10 Спортивая программа. 08 20 Концерт. 09 00 Кннига джунглей. 09 25 Приветствие. 09 30 Местная программа. 10 30 Репортаж. 10 55 Тележурнал. 11 50 Свет и тени. 14 00 "В поисках чудес". Фильм пр-ва Канады. 14 50 Концерт. 15 50 Приветствие. 16 00 Авто. 16 25 Телетеатр. 18 00 Документальный фильм. 18 50 Шанс на успех. 19 50 Местная программа. 20 00 Телетурнир. 20 35 Сказки не только для детей. 21 00 "Эмилия"Сериал пр-ва Канады. 22 00 Панорама. 22 30 Искусство в неволе. 23 00 Концерт. 01 00 Панорама. 01 05 Документальный фильм.

Аўторак, 9 траўня

Белорусское телевидение

День Победы

8.00 "Через всю войну". Фильм-концерт. 8.20 Фронтовой альбом. 8.25 "Поиск". Встреча ветеранов Великой Отечественной войны с учащимися Пуховичской школы. 8.40 Телебом-бис. Ансамбль "Полесская звездочка". 9.20 "Так это было..." 9.55 Парад войск Минского гарнизона и торжественное шествие участников Великой Отечественной войны. 12.45 К 50-летию Победы. "Лента воспоминаний". Представляет творческое об"единение "Телефильм". 13.15 "Поют ветераны". Концерт народного хора ветеранов войны и труда Дворца культуры профсоюзов. 13.40 "Помни имя свое". Худ. фильм. 15.20 "Майскими короткими ночами..." Телезарисовка. 15.25 "Военная музыка". Фильм-концерт. 15.50 Студия "Культура". "Женщина, война и весна". 16.50 Светлой памяти погибших в борьбе против фашизма. Минута молчания. 17.00 "Концерт - фронту". По страницам киносборников. 18.05 Телевизионный Дом кино. 1 Республиканский фестиваль "Поют актеры театра и кино". Часть 2-я. 18.55 Миг искренний. 19.35 Скрижали. Этот День Победы. 19.40 "Поздравляем Вас!" Музыкальная программа. 20.30 День столетия. 20.40 Колыбельная. 21.00 Новости. 22.00 "Был месяц май". Худ.фильм. 23.50 Гандбол. Чемпионат мира. Беларусь - Испания. 1.05 Под куполом Вселенной.

1 канал

5.00 Телеутро. 7.50 Москва. Красная площадь. Парад в честь 50-летия Победы. 9.05 "Иван". Худ. фильм. 10.15 За други своя... Панихида по воинам, жизнь свою за Отечество положившим. Москва. Поклонная гора. 10.55 Военный парад, открытие главного монумента и Центрального музея Великой Отечественной войны 1941-1945 годов на Поклонной горе. После окончания - Бокс. Чемпионат мира. 14.00, 22.40 Новости. 14.20 Трамвай "желание". 15.05 "Майские звезды". Худ. фильм. 16.50 Светлой памяти павших в борьбе против фашизма. Минута молчания. 17.00 "В шесть часов вечера после войны". Праздничная информационная программа. 18.05 "Белорусский вокзал". Худ. фильм. 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 21.10 Москва. 95-й. Белорусский вокзал. Молодые поют о войне.

Канал "Россия"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.35 Детство, опаленное войной. 7.55 Москва. Красная площадь. Парад в честь 50-летия Победы. 8.45 Репортажи с мест. 9.00 "Сретенка... Встречи..." Премьера телеспектакля. 10.15 "За други своя..." Панихида по воинам, жизнь свою за Отечество положившим. Москва. Поклонная гора. 10.55 Военный парад на Поклонной горе. Открытие главного монумента и Центрального музея Великой Отечественной войны 1941-1945гг. 13.20 "Когда-нибудь мы вспомним это..." 14.05 Репортаж с Арлингтонского мемориального кладбища в Вашингтоне. 14.25 В памяти народной. 14.55 Футбол. Чемпионат России. "Торпедо" - "Спартак"(Москва). 16.50 Светлой памяти павших в борьбе против фашизма. Минута молчания. 17.00 Мультфильм. 17.30 Видеопоэзия. С.Гудзенко. 17.35 Шарманшоу. Праздничный выпуск. 19.25 "Любить по-русски". Худ.фильм. 21.00 Праздничный салют. 21.20 Концерт ансамбля имени Александрова в Кеннеди-центр. 22.40 Река времени. 22.45 Автомиг. 22.50 "Хроника пикирующего бомбардировщика". Худ.фильм.

Санкт-Петербург

7.00 Доброе утро. 7.55 Парад на Красной площади в честь 50-летия Победы. 8.45 "Эстафета поколений". Концертная программа. 9.15, 10.50, 14.45, 15.10, 15.55, 16.05, 17.15, 18.25, 18.50 Этот День Победы... 9.20 "Дни войны". Премьера телефильма. 9.30 "Никто не забыт, ничто не забыто". Трансляция с Пискаревского мемориального кладбища-памятника. 10.55 Военный парад на Поклонной горе. Открытие главного монумента и Центрального музея Отечественной войны 1941 - 1945 гг. 13.00 "Летят журавли". Худ.фильм. 14.30, 18.30, 21.35 Информ ТВ. 14.50 "Мы любим эти песни". Песни военных лет. 15.15 "Бросайка". Праздничный выпуск. 16.00 Прохождение ветеранов войны по Невскому проспекту. 16.10, 17.20, 20.10 "Поклонимся великим тем годам". Концерт на Дворцовой площади. 16.50 Светлой памяти павших. Минута молчания. 17.00 "Милость мира". Благотворительный концерт в Казанском соборе. 18.55 "Бравые парни". Худ.фильм. 20.50 "Идут ветераны..." Видеофильм. 21.00 Праздничный салют на Неве в честь 50-летия Победы в Великой Отечественной войне. 22.05 "Мир входящему". Худ.фильм.

Польша - 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседы. 09 00 "Первые поцелуи". Сериал пр-ва Франции. 09 30 Программа для детей. 09 55 Гимнастика. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Дошкольники ддома. 10 50 Поговорим о детях. 10 55 Английский язык для детей. 11 00 "Бенони и Роса". Сериал пр-ва Норвегии. 12 05 Рынок труда. 12 20 Приглашение к столу. 12 30 Киножурнал. 12 50 Сто лет. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Образовательное телевидение. 13 15 Сельскохозяйсвенный журнал. 13 40 Компьютерная школа. 13 55 Книга чудес техники. 14 10 Великие открытия в науке и технике. 14 25 Атом, звезды, жизнь. 14 40 Камни с той и не с той Земли. 14 55 Счет математики. 15 10 Кухня. 15 25 Джойстик. 15 45 В мире науки. 15 50 Приветствиие. 16 00 Музыкальная программа. 16 30 Сами о себе. 17 00 "Первые поцелуи". Сериал пр-ва Франции. 17 30 Для детей. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Ария со смехом. 18 40 Автомания. 19 10 Мультсериал. 19 30 Сенсация XX века. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 "Перстень с орлом в короне". Фильм пр-ва Польши. 23 00 Пульс дня. 23 30 Сеймограф. 23 30 Люди, власть, деньги. 00 00 Новости. 00 15 Спортивнная студия. 23 45 Документальный фильм. 01 35 Родом из Польши. 02 05 Соседи. 02 35 Юбилейнная программа.

Польша - 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Утренний гость. 08 30 Английский язык. 08 40 Дневник страны. 09 00 Местная программа. 09 30 "Радиороманнс". Сериал пр-ва Польши. 10 05 Мир женщин. 10 30 "Клетка по за клеткой". Сериал пр-ва США. 11 00 "Путешествие в Африку". Сериал пр-ва Канады. 11 25 Телетурнир. 11 50 Телетеатр. 13 40 Мой маленький мир. 14 00 Панорама. 14 20 "Запретная любовь". Сериал пр-ва Испаннии. 15 05 Рок-программа. 15 40 Мультсериал. 15 45 Приветствие. 16 00 "Путешествие в Африку". Сериал пр-ва Канады. 16 30 Звездопад польского спорта. 17 00 Мысли о будущем. 17 30 Футбольный журнал. 18 00 Тележурнал. 18 10 В тени Кремля. 18 40 Католическая программа. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 00 Телетурнир. 20 35 Мультсериал. 21 00 Публицистическая программа. 21 50 Спортивная программа. 22 00 Панорама. 22 30 Экологическая программа. 22 40 Репортеры второй программы представляют. 23 00 "Битва в Арденах". Фильм пр-ва США. 01 25 Панорама. 01 30 Спортивная программа.

Серада, 10 траўня

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Скрижали. Этот День Победы. 7.55 "День циркового артиста". Телевизионный фильм. 9.00 Телевидение - школе. Белорусская литература. Современная белорусская драматургия. 9.35 Студия "Ч/б". Экология и дети. 10.05 "Зорная ростань". Телевизионный конкурс молодых артистов эстрады. Витебский тур. Передача 6-я. 11.00 Компьютерный полигон. 11.30 "Виктория". Телевизионный худ.фильм. 12.55 Туроб"ектив. Путешествия, встречи, отдых. 13.15 Видимо-невидимо. Новости кино-видео-аудио. 14.15 "Нов и К"-топ-ревю. 15.00 Новости. 15.10 По вашим просьбам. "Тихий Дон". Худ.фильм. 1-я серия. 16.55 Мультфильм. 17.10 Творческое молодежное об"единение "Крок". Закон и ты. Прямая линия. 18.00 АТН, Би-би-си, Си-эн-эн. 18.45 "Властелин людских сердец". Телеочерк. 19.15 "Страничка". По письмам зрителей. 19.25 Референдум. Круглый стол. 20.10 "Огненные версты". Вспоминает поэт Петро Приходько. 20.20 SOS. 20.25 День столетия. 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.35 Студия "Политика". 21.50 Клип-концерт. Влад Сташевский, Сергей Челобанов. 22.00 "Дети лжи". Док.фильм. 22.50 Под куполом Вселенной. 23.00 Новости. 23.20 "Сенсация". Худ.фильм. 0.15 Шоу-прогноз.

1 канал

5.00 Телеутро. 8.00, 11.00, 14.00, 22.55 Новости. 8.20 Курбан-Байрам. Трансляция из Соборной мечети Москвы. 9.10 "Аляска Кид". Телесериал. 10.05 "Природа мира". Научно-популярный телесериал. 13.00 "Иванов, Петров, Сидоров..." Информационно-развлекательная программа. 13.35 "Пойми меня". Телеигра. 14.20 Межгосударственная телерадиокомпания "Мир". 15.00 Посмотри, послушай... 15.20 "Путешествие в прошлое". Мультсериал. 15.50 Фэн-клуб. 16.00 Шпаргалка. 16.05 "Элен и ребята". Молодежный сериал. 16.30 Тип-тоник. 17.00, 20.00 Время. 17.15 "Угадай мелодию". Телеигра. 17.40 Дикое поле. 17.55 Час пик. 18.15 "Аляска Кид". Телесериал. 19.05 Кинопанарама. 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.45 "Крысы пустыни". Худ. фильм (США, Великобритания). 22.10 Версии. 22.30 Г.Юматов. Две жизни.

Канал "Россия"

7.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Ритмика. 7.40 Звезды говорят. 7.45 Требуются... требуются... 7.50 Время деловых людей. 8.15 Телегазета. 8.20 Всемирные новости Эй-би-си. 8.45 Формула 730. 9.15 Крестьянский вопрос. 9.35 Музыкальный экспромт. 9.45 "Санта-Барбара". Худ.фильм. 13.20 Момент истины. 14.15 "Этот разный, разный, разный Утесов..." 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Чья сторона? 16.20 Дальний Восток. 16.50 Карьера. 17.20 Никто не забыт. 17.25 "Сиди и смотри". Юмористическая программа. 17.40 Кто мы? 18.25 Своя игра. 19.25 Подробности. 19.35 "Санта-Барбара". Худ.фильм. 20.30 Док.фильм. 21.05 60 минут. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Футбол. Финал Кубка кубков. "Арсенал"(Лондон) - "Сарагоса" (Сарагоса).

Санкт-Петербург

12.00 Стиль жизни. 12.15 Мультфильмы. 12.35 "Немецкая волна". 13.00 Скорая помощь. 13.30 "Мануэла". Худ.фильм. 14.15 "Солнечный зайчик". Фильм-концерт. 14.30, 18.30, 21.40 Информ ТВ. 14.40 "За лесами, за горами". Худ.фильм. 15.50 Мы и банк. 16.20 Спартакиада СНГ. Тэаквондо. 17.10 Праздничный концерт. 18.00 Телемагазин. 18.05 Телеблиц. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 "Мануэла". Худ. фильм. 19.45 Телеслужба безопасности. 20.00 Театральный бинокль. 20.30 Блеф-клуб. 21.05 "Вот какой я отрицательный". Фильм-концерт. 22.00 Дневник Спартакиады. 22.30 Гороскоп. 22.40 "Молодые, красивые, вероятно, богатые". Худ.фильм (Италия). 0.05 "Замок Помпон Руж". Худ.фильм.

Польша - 1

